время просмотра. Значимость индивидуального выбора, высокая художественная ценность материала, возможность переключить внимание на новый сюжет обеспечили высокий уровень концентрации внимания на протяжении всех этапов работы, а также заставили задуматься о вопросах духовно-нравственного характера.

Аутентичные видеоматериалы обладают большими потенциальными возможностями для решения как учебных задач образовательного процесса неязыкового учреждения высшего образования, так и задач воспитания и развития молодежи при грамотной организации работы. Создавая атмосферу реальной языковой коммуникации, такие материалы способны обеспечить успешное развитие восприятия студентами-нелингвистами иноязычной речи, повысить мотивацию к изучению иностранного языка, способствовать развитию памяти, внимания, расширению кругозора обучающихся.


1. *Чикунова, А. Е.* Аутентичные видеоматериалы как средство развития социокультурной компетенции студентов экономических специальностей / А. Е. Чикунова, Н. Н. Сергеева // Педагогическое образование в России. – Екатеринбург, 2011. – № 1. – С. 147–158.

2. Кодекс Республики Беларусь об образовании : 13 января 2011 г., № 243-З : принят Палатой представителей 2 декабря 2010 г. : одобр. Советом Респ. 22 декабря 2010 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 14.01.2022 / ЭТАЛОН : информ.-поисковая система (дата обращения: 24.01.2024).



УДК 1:378.016



***В. М. Белакурскі,***

*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*


# ПРАБЛЕМНАЕ ВЫКЛАДАННЕ ФІЛАСОФІІ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ТВОРЧАЙ АСОБЫ


**Анатацыя.** Праводзіцца абгрунтаванне думкі аб тым, што праблемны метад навучання дазваляе ў сучасных умовах найбольш эфектыўна развіваць філасофскае мысленне студэнтаў, аналізаваць філасофскія

аспекты сацыякультурных праблем, знаходзіць рацыянальныя шляхі ў іх рашэнні. Раскрываюцца ўзроўні праблемнага навучання, а таксама якасці творчай асобы, якія фарміруюцца падчас праблемнага навучання. Аргументавана даводзіцца тое, што арсенал праблемнага метаду дапамагае сёння ў выхаванні не толькі адукаванай, але і творчай асобы, здольнай прымаць нестандартныя рашэнні ў будучай прафесійнай дзейнасці і асабістым жыцці.

**Ключавыя словы:** філасофія, пазнавальны працэс, інавацыйныя тэхналогіі, праблема, праблемнае выкладанне, праблемны метад, творчая асоба, якасці творчай асобы, прафесійная падрыхтоўка, культурная дзейнасць.

***V. Belakurski,***
*PhD in of Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social and Humanitarian Disciplines of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

## PROBLEMATIC TEACHING OF PHILOSOPHY AS A MEANS OF FORMING A CREATIVE PERSONALITY

**Abstract.** The article substantiates the idea that the problem-based teaching method allows in modern conditions to develop the philosophical thinking of students most effectively, to analyze the philosophical aspects of socio-cultural problems, and to find the most rational ways to solve them. The author reveals the levels of problem-based learning, as well as the qualities of a creative person, which are formed by problem-based learning. It is argued that the use of the problem-based method helps today in raising not only an educated, but also a creative person, capable of making non-standard decisions in the future professional activity and personal life.

**Keywords:** philosophy, cognitive process, innovative technologies, problem, problem-based teaching, problem-based method, creative person, qualities of a creative person, professional training, cultural activity.

Пераход ад традыцыйных тэхналогій да інавацыйных у гуманітарным адукацыйным працэсе сучаснага ўніверсітэта прадугледжвае, перш-наперш, пошук тых методык і форм навучання, якія найбольш актыўна змаглі б садзейнічаць умацаванню творчага пачатку ў дзейнасці студэнтаў. Аналізуючы сучасныя яму перашкоды ў выкладанні філасофіі, Г. Гегель падкрэсліваў, што яны звычайна ўзнікаюць, калі «новая ідэя філасофіі яшчэ застаецца без навуковай распрацоўкі, а матэрыял прыватных навук не поўнасцю перайшоў у новую ідэю» [1, с. 419].

Мэта выкладання філасофіі – фарміраванне агульнакультурных, а па некаторых напрамках падрыхтоўкі і прафесійных кампетэнцый, у змест якіх уваходзяць не толькі веданне паняційнага апарату і асаблівасцей філасофскага разумення свету. Да гэтага таксама патрэбна аднесці здольнасці да творчага мыслення, сістэмнага аналізу нетрывіяльных прафесійных і жыццёвых сітуацый, а таксама ўменне выкарыстоўваць атрыманыя веды ў абгрунтаванні выбраных стратэгій паводзін.

Адной з галоўных задач у методыцы выкладання філасофіі выступае патрэба выразна акрэсліць асноўныя філасофскія праблемы, раскрыць іх змест і шляхі рашэння, або прапанаваць студэнтам зрабіць апошняе самастойна. Аднак у большасці падручнікаў па філасофіі, як і раней, прадстаўлены апавядальны метад падачы матэрыялу. У выніку студэнту даволі складана зразумець своеасаблівасць філасофскай дзейнасці. Таму ён не задумваецца над філасофскімі праблемамі, не гаворачы аб імкненні разважаць і рабіць самастойныя вывады. М. К. Мамардашвілі пісаў, што «філасофія не прадстаўляе сабой сістэму ведаў, якую можна было б перадаць іншым і тым самым іх навучыць» [3, с. 14]. Аўтар адзначаў, што шлях філасофіі пралягае праз асабістыя цяжкасці, пераадольваючы іх мы набываем неабходны і ўнікальны вопыт.

Элементы праблемнага падыходу можна знайсці ў антычнай маеўтыцы Сакрата, дзякуючы якой ён накіроўваў вучняў да самастойнага пошуку ісціны. Падкрэслім, што і сёння праблемны характар носіць навучанне, якое прадугледжвае мэтанакіраваную пастаноўку і выкарыстанне паслядоўна ствараемых праблемных сітуацый, пошук і выбар шляхоў для найбольш аптымальнага іх рашэння. Стварэнне праблемнай сітуацыі ў сучаснай студэнцкай аўдыторыі – адна з найгалоўнейшых задач, якая разам з тым найбольш цяжкая. Калі для адбору і сістэматызацыі вучэбных пытанняў у той ці іншай тэме выкладчыку дастаткова добра ведаць дысцыпліну, то для стварэння праблемнай сітуацыі ён павінен быць узброены веданнем псіхалогіі студэнцкай аўдыторыі, а таксама аб'ёму і ўзроўню ведаў студэнтаў, найбольш распаўсюджаных стэрэатыпаў мыслення, уменнем кіраваць пазнавальнай дзейнасцю, наладжваць зваротную сувязь, валодаць добрай лагічнай падрыхтоўкай, шырокім асабістым наборам розных прыёмаў арганізацыі форм навучальнага працэсу.

Зразумела, што ператвараць вучэбны матэрыял у праблемны немагчыма і непатрэбна. Так, лекцыі найперш за ўсё павінны перадаць студэнту неабходны аб'ём інфармацыі. Але і тут існуе шэраг варыянтаў праблемнага выкладання матэрыялу. Задача выкладчыка – данесці да студэнта лагічныя і арганізацыйныя формы, у якіх адбывалася творчае развіццё філасофскай навукі тых ці іншых яе напрамкаў, адначасова з гэтым імкнуцца паказаць навуку ў тым яе выглядзе, у якім яе бачыць сучасны даследчык.

Менавіта на семінарскіх занятках праблемныя сітуацыі павінны ўзнікаць як свядома, так і стыхійна. Крыніцай стыхійных праблемных сітуацый, як правіла, выступаюць самі студэнты, выказваючы супрацьлеглыя меркаванні па адным і тым жа пытанні. Задача выкладчыка ў дадзеным выпадку заключаецца ў тым, каб умела кіраваць дыскусіяй, карэктна падводзячы спрэчку да навукова выверанных вынікаў у адпаведнасці з мэтай семінара. «Незапланаваная» праблемная сітуацыя з разгортваннем дыскусіі можа ўзнікнуць з пытання студэнта да выкладчыка. Галоўнае павінна заключацца ва ўменні выкладчыка арганічна ствараць, нават «правакаваць» гэту сітуацыю. Падкрэслім, што дадзенае пытанне можа больш зацікавіць групу, выклікаючы павышаную актыўнасць, чым нават тое, што было запланавана.

Праблемная сітуацыя заяўляе аб сабе як больш-менш асэнсаваная цяжкасць разумовага кшталту, якая ўзнікае паміж наяўнымі ведамі і тым, што яшчэ неабходна вырашыць. Рэалізацыя прынцыпу праблемнасці ў розных формах навучальнага працэсу дае спецыфічныя варыянты праблемнага навучання, якія адрозніваюцца па ўзроўні і сродках праблемнага падыходу, па спосабе стварэння праблемных сітуацый, па ступені самастойнасці навучэнцаў. Выдзяляючы ў якасці асноўных форм навучальнага працэсу лекцыю, семінар і вучэбна-даследчую працу, адпаведна атрымліваем 3 узроўні праблемнага навучання:

– праблемнае выкладанне;
– рашэнне вучэбна-праблемных задач;
– праблемны пошук.

Якасці творчай асобы, якія фарміруюцца праз праблемнае навучанне, умоўна можна падзяліць на 4 групы, у адпаведнасці з іх ролямі у праблемным пошуку:

1. Якасці, што садзейнічаюць пастаноўцы праблемы:

– дапытлівасць;

– здольнасць бачыць праблемы там, дзе іншым усё зразумела;

– імкненне да супярэчнасці.

2. Якасці, здольныя аблегчыць сістэматызаваны навуковы пошук:

– мэтанакіраванасць, упартасць, настойлівасць у рашэнні праблемы;

– высокая працавітасць;

– імкненне да яснасці ў ведах, схільнасць да іх класіфікацыі і сістэматызацыі;

– накіраванасць асабістай дзейнасці на інтэлектуальныя і духоўныя працэсы.

3. Якасці асобы, неабходныя для генералізацыі новых ідэй:

– здольнасць да самастойных разважанняў;

– здольнасць да камбінавання ідэй, а таксама шырокіх абагульненняў;

– развітае ўяўленне, наяўнасць пачуцця прыгожага і гармоніі.

4. Якасці, неабходныя для фарміравання новых ідэй:

– дыялектычная гнуткасць мыслення;

– шырыня поглядаў;

– наяўнасць ідэалаў, упэўненасць у іх рэалізацыі;

– добра развітае пачуццё гумару, якое дазваляе кінуць погляд на ранейшыя памылкі і прадухіліць іх.

Праблемы задаюцца сістэмай вывучаемай дысцыпліны і служаць сродкам засваення гэтай сістэмы. Мастацтва праблемнага навучання – гэта ўменне ставіць пытанні, разгортваць спрэчкі, даказваць, пераконваць. Выкладчыку варта інтэграваць вучэбны матэрыял вакол фундаментальных ідэй вучэбнага курса, выдзяляючы адпаведную іерархію праблем: «дыялектыка – метафізіка», «матэрыя – свядомасць», «існасць – час», «прырода – грамадства», «пазнанне – практыка», «свабода – неабходнасць», «культура – цывілізацыя». Характэрная асаблівасць праблемнага навучання – наяўнасць альтэрнатыўных поглядаў ці падыходаў, якія патрабуюць іх крытычнага аналізу. Вучэбна-праблемная задача ў першую чаргу накіравана на фарміраванне

способу дзеянняў і ўяўляе сабой сукупнасць пытанняў, якія ствараюць праблемную сітуацыю, арыентуючы студэнтаў на істотныя прыметы паняццяў і з'яў, якія яны павінны засвоіць. У якасці найбольш эфектыўных сродкаў, што падводзяць студэнтаў да самастойнага рашэння пастаўленых пытанняў і фарміравання лагічнай структуры думкі на семінарскіх занятках, патрэбна выдзеліць наступныя: эўрыстычная гутарка, разбор антынамічнай сітуацыі, сакратычны дыялог, дыскусія, сумесны мазгавы штурм, абмеркаванне дакладаў і рэфератаў.

Інавацыйныя методыкі, якія выкарыстоўваюцца ў першую чаргу, накіраваны на рэалізацыю праблемнасці як прынцыпу выкладання. Яны ўтрымліваюць дыдактычную задачу: стварэнне на кожным з заняткаў праблемнай сітуацыі, у час вырашэння якой студэнты вучацца самастойнаму крытычнаму мысленню, здольнасці аргументавана адстойваць і фармуляваць асабістае меркаванне. Асноўная мэта такой методыкі – пашыранае ўключэнне ў творчы дыспут кожнага студэнта, фарміраванне ўнутранай матывацыі на ўдзел у сумесным абмеркаванні пастаўленых пытанняў. Пры пастаноўцы філасофскай праблемы выкладчык павінен імкнуцца да стварэння адпаведных умоў, у якіх студэнты змаглі б авалодаць не толькі пэўнай сумай ведаў, але спосабамі іх атрымання і прымянення. Толькі такія актыўна здабытыя веды могуць арганічна ўвайсці ў сістэму перакананняў асобы [2, с. 122].

1. *Гегель, Г. В. Ф.* О преподавании философии в университетах / Г. В. Ф. Гегель // Работы разных лет : в 2 т. / сост., общая ред. и вступ. статья А. В. Гулыги. – М. : Мысль, 1970. – Т. 1. – С. 417–427.

2. *Кондратьева, С. Б.* Проблемы преподавания философии в вузе: проблемы, прогнозы, перспективы / С. Б. Кондратьева // Проблемы педагогики и психологии. – 2018. – № 4. – С. 122–129.

3. *Мамардашвили, М. К.* Как я понимаю философию / М. К. Мамардашвили // Как я понимаю философию / М. К. Мамардашвили. –2-е изд., измен. и доп. – М., 1992. – С. 14–27.